Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

1 верасня 2017 года, № 12 (2180)

ПРЫЁМНАЯ КАМПАНІЯ

Абітурыенты б’юць рэкорды

У БДУ падведзены вынікі прыёмнай кампаніі 2017 года. На ўсе формы атрымання вышэйшай адукацыі першай ступені залічаны практычна 5,5 тысяч абітурыентаў. Гэта самая паспяховая прыёмная кампанія па ўзроўні падрыхтаванасці абітурыентаў БДУ!

Сёлета сярэдні бал тых, хто паступіў на дзённую бюджэтную форму навучання па выніках ЦТ, – **321** (у 2016 г. – 300)! Сярод іх 70,3 % набралі 300 балаў і больш (у 2016 г. – 63 %).

Зафіксаваны РЭКОРДНЫЯ сярэднія балы: на факультэце міжнародных адносін – 380, а таксама на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі – 359!

Усяго на дзённую бюджэтную форму залічаны 2164 абітурыенты. Сярэдні конкурс па ўніверсітэце склаў 2 чалавекі на месца (у 2016 г. – 1,6).

Без іспытаў залічаны 134 абітурыенты.

Па мэтавым прыёме залічаны 44 абітурыенты.

На скарочаны тэрмін атрымання адукацыі залічаны 16 абітурыентаў.

Таксама адзначым той факт, што сёлета выросла колькасць залічаных, якія скончылі сярэднюю школу з медалямі або ўстановы сярэдняй спецыяльнай адукацыі з дыпломамі з адзнакай – 27,6 % (у 2016 г. – 25,5 %). Колькасць выпускнікоў ліцэяў і гімназій склала 52,6 % (у 2016 г. – 52 %). Мінчукоў сярод залічаных 710, што складае 32,8 % (у 2016 г. – 33,5 %).

Сярэдні бал залічаных на прыродазнаўчанавуковыя факультэты:

Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі – 359;

Хімічны факультэт – 346;

Механіка-матэматычны факультэт – 325;

Факультэт радыёфізікі і камп’ютарных тэхналогій – 313;

Біялагічны факультэт – 313.

Рэйтынг самых высокіх прахадных балаў сярод прыродазнаўчанавуковых спецыяльнасцяў:

«Прыкладная інфарматыка» – 372 (у 2016 г. – 364);

«Інфарматыка» – 360 (у 2016 г. – 349);

«Актуарная матэматыка» – 352 (у 2016 г. – 338);

«Камп’ютарная бяспека» – 352 (у 2016 г. – 335).

Сярэдні бал залічаных на сацыяльна-эканамічныя і гуманітарныя факультэты і інстытуты:

Факультэт міжнародных адносін – 380;

Інстытут бізнесу і менеджменту тэхналогій – 378;

Юрыдычны факультэт – 368;

Эканамічны факультэт – 359;

Факультэт філасофіі і сацыяльных навук – 356.

Рэйтынг самых высокіх прахадных балаў сярод сацыяльна-эканамічных і гуманітарных спецыяльнасцяў:

«Міжнародныя адносіны» – 384 (у 2016 г. – 382);

«Міжнароднае права» – 384 (у 2016 г. – 382);

«Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі» – 382 (у 2016 г. – 376);

«Паліталогія» – 382 (у 2016 г. – 362).

Конкурс і прахадныя балы на спецыяльнасці з творчым выпрабаваннем:

«Дызайн (напрамак – камунікатыўны дызайн)» – конкурс 18,7 чалавека на месца, прахадны бал – 280;

«Дызайн (напрамак – дызайн прадметна-прасторавага асяроддзя)» – конкурс 10 чалавек на месца, прахадны бал – 248.

Сёлета на спецыяльнасці Інстытута журналістыкі конкурс склаў 2,3 чалавека на месца. Самыя высокія прахадныя балы склалі:

«Журналістыка (напрамак – аўдыявізуальная)» – 420;

«Журналістыка (напрамак – вэб-журналістыка)» – 380.

Прахадныя балы і конкурсы на спецыяльнасцях са скарочаным тэрмінам навучання (для выпускнікоў УССА):

«Дызайн (напрамак – камунікатыўны дызайн)» – конкурс 6 чалавек на месца, прахадны бал – 248;

«Дызайн (напрамак – дызайн прадметна-прасторавага асяроддзя)» – конкурс 5 чалавек на месца, прахадны бал – 244;

«Правазнаўства» – конкурс 4,2 чалавека на месца, прахадны бал – 199.

На дзённую платную форму залічаны 1958 абітурыентаў. Сярэдні конкурс па ўніверсітэце склаў 1,5 чалавека на месца.

На скарочаны тэрмін атрымання адукацыі залічаны 32 абітурыенты.

Па хадайніцтве спартыўных федэрацый і саюзаў у адпаведнасці з п. 33 Правілаў прыёму залічаны 46 абітурыентаў.

Таксама адзначым, сярод залічаных 9,5 % скончылі сярэднюю школу з медалямі або ўстановы



Інфаграфіка Валеры БАНДАРЧЫК

сярэдняй спецыяльнай адукацыі з дыпломамі з адзнакай (у 2016 г. – 7,6 %). Выпускнікі ліцэяў і гімназій складаюць 45,7 % (у 2016 г. – 45,2 %).

Сярэдні бал тых, хто паступіў па выніках ЦТ, складае 265 (у 2016 г. – 252), сярод іх 28 % (у 2016 г. – 27 %) набралі 300 балаў і больш; 88,3 % (у 2016 г. – 77 %) набралі 200 балаў і больш.

Рэйтынг самых высокіх прахадных балаў сярод прыродазнаўчанавуковых спецыяльнасцяў:

«Інфарматыка» – 300 (у 2016 г. – 237);

«Прыкладная інфарматыка» – 293 (у 2016 г. – 254);

«Прыкладная матэматыка» – 291 (у 2016 г. – 237);

«Хімія лекавых злучэнняў» – 288 (у 2016 г. – 262).

Самыя высокія прахадныя балы сярод сацыяльна-эканамічных і гуманітарных спецыяльнасцяў:

«Інфармацыя і камунікацыя» – 336 (у 2016 г. – 316);

«Міжнароднае права» – 326 (у 2016 г. – 322).

На завочную бюджэтную форму залічана 255 абітурыентаў. Сярэдні конкурс па ўніверсітэце склаў 2,6 чалавека на месца.

На скарочаны тэрмін навучання залічана 89 абітурыентаў.

Сярод залічаных 10,2 % скончылі ўстановы сярэдняй спецыяльнай адукацыі з дыпломамі з адзнакай.

З усіх абітурыентаў, залічаных па выніках здачы ЦТ, маюць сумарны бал 200 і вышэй 49 %.

Рэйтынг самых высокіх прахадных балаў завочнай бюджэтнай формы навучання:

«Гісторыя» – 225;

«Медыцынская экалогія» – 222;

«Менеджмент» – 217;

«Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» – 205.

На спецыяльнасцях са скарочаным тэрмінам навучання (для выпускнікоў УССА) конкурс і прахадныя балы склалі:

«Сацыяльная работа» – конкурс 6,8 чалавека на месца, прахадны бал – 247;

«Руская філалогія» – конкурс 1,5 чалавека на месца, прахадны бал – 244;

«Менеджмент, фінансы і крэдыт» – конкурс 5,4 чалавека на месца, прахадны бал – 224.

На завочную платную форму залічана 977 абітурыентаў. Сярэдні конкурс па ўніверсітэце склаў 1,5 чалавека на месца.

На скарочаны тэрмін навучання залічана 286 абітурыентаў.

Для атрымання другой вышэйшай адукацыі залічана 236 абітурыентаў.

Рэйтынг самых высокіх прахадных балаў:

«Правазнаўства» – 214;

«Матэматыка і інфармацыйныя тэхналогіі» – 213.

Зараз на платную форму навучання залічана 120 замежных грамадзян. Прыём замежных грамадзян у БДУ працягваецца да 15 кастрычніка.

Паводле інфармацыі прыёмнай камісіі, прэс-службы БДУ

МУЛЬТЫМЕДЫЙНЫ КАНТЭНТ

Уладальнікамі новых кватэр сталі 57 супрацоўнікаў БДУ. Дом пабудаваны ў Фрунзенскім раёне па вул. Маршала Лосіка, 4.

З навасельлем!

Новы дом – у Год навукі

У святочнай цырымоніі здачы дома 29 жніўня прынялі удзел намеснік кіраўніка адміністрацыі Фрунзенскага раёна Мінска Аляксандр Некрашэвіч, а таксама старшыня прафкама супрацоўнікаў БДУ Ігар Вярэнчыкаў.

Нагадаем, што рашэннем Мінгарвыканкама ад 18.08.2016 г. УКБ Фрунзенскага раёна Мінска даручана будаўніцтва 50 % агульнай плошчы жылых памяшканняў у шматкватэрным доме ў межах вул. Шаранговіча, Гарэцкага, Рафіева, мікрараён № 3 для прафесарска-выкладчыцкага складу і іншых супрацоўнікаў БДУ і 50 % па спісах РУП «Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па механізаванні і сельскай гаспадарцы» для навукоўцаў і супрацоўнікаў. З 57 кватэр супрацоўнікаў БДУ 1-пакаёвых – 15, 2-пакаёвых – 28, 3-пакаёвых – 14.

У мэтах удасканалення грамадскага кантролю стану ўліку працаўнікоў БДУ, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, загадам рэктара БДУ ад 28.10.2016 г. створана грамадская камісія па жыллёвых пытаннях пад старшынствам прарэктара па выхаваўчай і вучэбнай рабоце У. В. Суворава.

Па словах сакратара камісіі Алены Шчатко, прыкладна 80 % супрацоўнікаў з новага дома з'яўляліся жыхарамі інтэрната БДУ. Паводле праектнай дэкларацыі кошт 1 кв. м. агульнай плошчы кватэры для нармаванай плошчы склаў 1 058 рублёў 29 капеек, для плошчы, якая перавышае нармаваную, – 1 202 рублі 9 капеек.

Дзякуючы дадзенаму будаўніцтву, на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, на 23.08.2017 г. засталося ўжо 422 супрацоўнікі за кошт забудоўшчыкаў, што выбылі.

У жніўні таксама стала вядома пра рашэнне Мінгарвыканкама пра вылучэнне яшчэ 51 кватэры ў раёне вул. Міхалова, Алібегава, Чыгуначная для супрацоўнікаў БДУ. Застаецца чакаць выхаду праектнай дэкларацыі для пачатку будаўніцтва новага дома.

Зыходзіць з рэальнай сітуацыі

Старшыня прафкама супрацоўнікаў БДУ **Ігар ВЯРЭНЧЫКАЎ** лічыць, што кіраўніцтва ўніверсітэта надае сацыяльнаму пытанню самую шчырую і пільную ўвагу: «Магчымасць атрымаць уласнае жыллё – важны стымул для супрацоўнікаў лепш працаваць. Таму мы ўвесь час хадайнічаем ад імя прафсаюза і, у першую чаргу, ад імя рэктара ва ўсе інстанцыі пра вылучэнне кватэр пад будаўніцтва. Вось здалі 57 кватэр, і неўзабаве вылучылі яшчэ 51 кватэру. Дзякуй мэру горада і яго намесніку за тое, што вельмі сур'ёзна дапамагаюць».

– Такое адчуванне, што наш універсітэт хутчэй забяспечвае сваіх супрацоўнікаў жыллём, чым па чарзе ў горадзе. Як так атрымліваецца?

– Не блытайце розныя паняцці. У горадзе людзі чакаюць ільготных крэдытаў, а мы будуем за свой кошт. Вось як гэта гучыць: «…для паляпшэння жыллёвых умоў супрацоўнікаў, якія стаяць на адпаведным уліку, паводле рашэння Мінгарвыканкама прадугледжана вылучэнне каля 57 кватэр без прыцягнення сродкаў дзяржаўнай падтрымкі з прыбыткам замоўцы, што не перавышае 5 %». Гэта значыць, у сярэднім квадратны метр для нашых працаўнікоў каштуе 500 у. а. З улікам таго, што на дадзены момант камерцыйны кошт значна вышэйшы, каля 700–1000 у. а.

– Ігар Раманавіч, што б Вы жадалі сказаць людзям, улічваючы Вашу дзейнасць?

– Трэба, каб людзі з разуменнем паставіліся да таго, што мы жадаем яшчэ раз удакладніць спісы тых, хто стаіць у чарзе. Калі мы размяркоўвалі 57 кватэр, закранулі 130-га чалавека ў чарзе. Адна справа, калі чалавек адмаўляецца з-за адсутнасці фінансавай магчымасці, і іншая справа, калі высвятляецца, што ў кагосьці няма правоў на паляпшэнне жылля. Людзі ўжо пабудаваліся, ці штосьці змянілася ў жыцці, а часу ці жадання паведаміць камісіі ў іх няма. Можа, яны яшчэ на штосьці разлічваюць? Яны штучна павялічваюць чаргу. Трэба, каб людзі думалі не толькі пра сябе, але і пра сваіх калегаў. Калі ты дакументальна можаш пацвердзіць свае правы, то калі ласка, будзем усяляк падтрымліваць. Калі няма, то знайдзі час паінфармаваць пра гэта. Вельмі б хацелася да канца бягучага года мець рэальны спіс тых, хто мае патрэбу ў жыллі, каб можна было зыходзіць з рэальнай сітуацыі.

Усё адбывалася, як у фільме «Гараж»

Сваімі ўражаннямі падзяліліся навасельцы:

Віктар КОЧЫН, намеснік начальніка ЦІТ

– Віктар Паўлавіч, Вы стаялі ля вытокаў і былі галоўным арганізатарам і ініцыятарам пабудовы гэтага дома. Чаму гэтым заняліся?

– У нас даўно не будаваліся дамы. Апошнія ішлі для навуковых супрацоўнікаў і выкладчыкаў, а ўніверсітэт вялікі, і людзей вельмі шмат. Некаторыя стаялі на чарзе з 80-х, 90-х гадоў, людзі даўно чакаюць. Хацелася, каб іх жыллёвыя ўмовы паляпшаліся.

– Кім курыравалася дадзенае пытанне?

– Усе рашэнні прымаліся з узгадненнем кіраўніцтва: рэктара Сяргея Уладзіміравіча Абламейкі і прарэктара Уладзіміра Васільевіча Суворава. Актыўную дапамогу аказваў прафсаюз у асобе старшыні Вярэнчыкава Ігара Раманавіча. Была створана камісія па паляпшэнні жыллёвых умоў, прызначаны сакратар камісіі. Усё паводле нормаў заканадаўства.

– Хто старшыня вашага кааператыву?

– Дом будаваўся долевым спосабам, гэта не кааператыў. Г. зн. дамова з УКБ ідзе ў кожнага індывідуальна. Старшыні няма. Хоць людзі прыходзілі да мяне па розных пытаннях, дапамагаў як мог.

– Якая атмасфера была сярод забудоўшчыкаў?

– Вы глядзелі фільм Разанава «Гараж»? Усё, што адбывалася шмат гадоў назад, яно і цяпер актуальнае. Кватэрнае пытанне вельмі важнае для людзей. Яны будуюць за свае кроўныя грошы, і ім кожная дробязь здаецца вельмі значнай. Вядома, атмасфера была злёгку абвостраная. Хто патрапіць ці не патрапіць, адмовіцца, не адмовіцца. Усе былі ўсхваляваныя, але гэта былі прыемныя хваляванні.

– Якія пачуцці перажывае чалавек, які выплачвае апошні ўнёсак за кватэру?

– Эмоцыі супярэчлівыя. Трохі павялічыўся апошні ўнёсак, але добра, што ўсё скончылася. Гэта жыццё. Мы рады, што, прынамсі, 57 чалавек мы зрабілі шчаслівымі. Бадай большасць з іх жыве ў інтэрнаце, і цяпер у іх сапраўднае свята.

Чарга падышла толькі ва ўніверсітэце

Міхаіл РАДЗЬКО, старшы выкладчык кафедры педагогікі

– Што адчуваеце, абзавёўшыся сваім жыллём?

– Вядома, радасць, 10 гадоў у чарзе. Былі свае нюансы пры пабудове дома, але ў цэлым дом будаваўся нядоўга. Трохі падаражэў у канцы. Але кошт пад'ёмны: 1079 рублёў за метр. Гэта крыху больш за 500 у. а. Кватэры вельмі вялікія. Да прыкладу, у мяне аднапакаёвая кватэра 53,7 метра. Двухпакаёўка – у раёне 70, трохпакаёвая – 93. Адпаведна, мінімальная сума грошай павінна быць на 53 метры. Нам яшчэ пашанцавала. Бо спачатку адмянілі 585 указ пра аказанне матэрыяльнай дапамогі на дзяцей, а потым цудам вярнулі для тых, у каго былі складзены дамовы да жніўня.

Дзякуй універсітэту за магчымасць атрымаць жыллё, таму што з гэтым цяпер сапраўды вельмі складана.

Віктар АСТРОГА, загадчык кафедры мытнай справы ФМА

– Віктар Аляксандравіч, якія пачуцці напярэдадні падзеі, пераезду?

– Велізарная радасць і гонар за свой універсітэт. Я сам выпускнік гістарычнага факультэта. Я – ад самага пачатку патрыёт БДУ. Дысертацыя мая была прысвечана збольшага БДУ, гісторыі навукі. Жонка мая працуе ў БДУ. Ва ўніверсітэце працую з 2008 года загадчыкам кафедры, рыхтую спецыялістаў. Наша кафедра мытнай справы з'яўляецца вядучай у сваёй галіне. Студэнты паступаюць да нас, у самы лепшы ўніверсітэт краіны. І я думаю, што вядучая ВНУ павінна прапаноўваць жыллё сваім выкладчыкам, што яна і робіць высілкамі рэктара, нашай адміністрацыі. Таму, натуральна, я лічу, што ўсё гэта вельмі правільна, і, вядома, кватэра мая дзякуючы таму, што я працую ў БДУ, універсітэце, які шануецца ў краіне.

– Калі жыллё ёсць, адкрываюцца новыя перспектывы…

– Можна паставіць кропку з жыллёвымі пытаннямі і спакойна працаваць, таму што, як кажуць, тыл, кватэра – гэта вельмі важна для любога спецыяліста, у тым ліку і для выкладчыка, які мусіць займацца навукай, студэнтамі.

– Вы самі адкуль? Ці думалі, што станеце мінчуком?

– Я родам з Баранавічаў. Скончыў універсітэт, патрапіў па размеркаванні ў Асіповічы, паступіў у аспірантуру БДУ. На чарзе ў нашым Маскоўскім раёне ўсё вельмі доўга, таму менавіта дзякуючы БДУ я атрымаў кватэру. У звычайнай чарзе, як маладая сям'я. Так, сям'я ўжо даўно не маладая: сын працуе і дачка – студэнтка.

– Складана было фінансава пабудавацца?

– Вядома, дапамагала ўся сям'я, сваякі. Нягледзячы на тое, што сума ў два разы меншая за звычайную, яна ўсё адно досыць вялікая. Але я даўно збіраўся, планаваў. Дзякуй маім сваякам, якія падставілі плячо і дапамаглі своечасова сабраць сродкі.

Хачу сказаць, што аўтарытэт універсітэта, які дапамагае ў побытавых пытаннях, яшчэ больш умацаваўся ў маіх вачах. Я і далей буду аддаваць яму ўсе сілы без усякага пафасу. Я працаваў і ў мытных органах і ў акадэміі навук, усюды стаяў на чарзе, але падышла яна толькі ў нас ва ўніверсітэце.

Ніна УРУБЛЕЎСКАЯ, намеснік дырэктара юрыдычнага каледжа

– Распавядзіце, як гэта – стаць шчаслівым уладальнікам кватэры?

– Яшчэ да канца не ўсвядоміла. Удзячная ўніверсітэту за атрыманую магчымасць. На чарзе стаяла доўга, я працую ў БДУ 16 гадоў. Былі моманты, як заўсёды, але ў цэлым усё добра. Дом – гэта самае важнае для чалавека, і калі такое пытанне вырашаецца, гэта матывуе не толькі працоўную дзейнасць, але і жыццё грае іншымі фарбамі.

Вольга КЛАПАЦЬ, метадыст УМС

– Вольга Васільеўна, марылі стаць сталічным жыхаром?

– Вядома. Я сама з Брэсцкай вобласці, г. Бяроза. Нарадзілася ў Германіі, у сям'і вайскоўцаў. Я не ўяўляю іншай працы, акрамя майго ўлюбёнага ўніверсітэта. Я з 1999 года злучана з ім і адчуваю велізарную ўдзячнасць. Заўсёды верыла ў мару, і яна ў мяне спраўдзілася. Сёлета я загадала жаданне пра кватэру, яно здзейснілася. Гэта цудоўна!

– Якія былі складанасці з будаўніцтвам?

– Ды не было асаблівых складанасцяў. Недахоп часу на ўсе папяровыя справы: і ў банк трэба было, і ва УКБ і г. д. Наш дом прыгожы, яркі. Кватэры вялікія, з шыкоўнымі балконамі. З 6 паверха шкло ад падлогі на балконах, і выгляд, вядома, цудоўны, я ў захапленні ад гэтай прыгажосці.

– Няпроста, напэўна, грошы было сабраць?

– Ды я наогул не чакала, што будуць будавацца. Калі патэлефанавалі, прапанавалі паўдзельнічаць, падумала, што гэта жарт. Але пры вялікай падтрымцы маіх родных і блізкіх(я яшчэ ўзяла крэдыт у «Беларусбанку»), у мяне ўсё атрымалася. Дзякуй вялікае нашаму ўніверсітэту за магчымасці, і хачу пажадаць усім верыць у сваю мару – яна абавязкова спраўдзіцца!

Калі будавалася жыллё БДУ

У 2011 годзе пабудаваны асобны дом на 110 кватэр для ПВС па вул. Чачота, 32. У 2013 годзе міжуніверсітэцкі кааператыў на Каменнай Горцы – 25 кватэр. У 2015/16 годзе вылучана 47 кватэр у якасці арэндnага жылля ў комплексе «Магістр». 2017 год – 57 кватэр у доме па вул. Маршала Лосіка, 4.

Таццяна БАГАМАЗАВА
Фота аўтара

РЭЙТЫНГІ

На шляху да эліты

БДУ працягвае рост у Сусветным вэбаметрычным рэйтынгу ўніверсітэтаў Webometrics Ranking of World Universities (WRWU). У новай рэдакцыі рэйтынгу БДУ заняў 506 месца, падняўшыся на 131 пазіцыю ў параўнанні з мінулымі паказчыкамі.

Усяго ў рэйтынгу Webometrics улічваюцца дадзеныя больш як 26 000 вышэйшых навучальных устаноў (усяго ў свеце налічваецца больш за 30000 ВНУ). Лідарамі па традыцыі з'яўляюцца Гарвардскі ўніверсітэт, Стэнфардскі ўніверсітэт і Масачусецкі тэхналагічны інстытут.

БДУ стабільна ўваходзіць у тройку найлепшых універсітэтаў СНД, саступаючы Маскоўскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту імя М. В. Ламаносава (215 месца) і Санкт-Пецярбургскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту (480 месца). Сярод найлепшых універсітэтаў краін-суседзяў у рэйтынгу прадстаўлены: Варшаўскі ўніверсітэт (402 месца), Тартускі ўніверсітэт (442), Вільнюскі ўніверсітэт (768), Латвійскі ўніверсітэт (1224), Кіеўскі нацыянальны ўніверсітэт імя Тараса Шаўчэнкі (1296).

Сярод беларускіх ВНУ БДУ нязменна захоўвае першынство. Другое месца займае БНТУ – 3060 пазіцыя. Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце РБ – на 3084 пазіцыі, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы на 3317 пазіцыі і БДУіР на 3569.

Адзначым, на працягу апошніх гадоў БДУ высока каціруецца ў рэйтынгу WRWU, уваходзячы ў 2 % найлепшых сусветных універсітэтаў. Нагадаем, БДУ сёлета паказаў высокія вынікі ў трох найбуйнейшых сусветных рэйтынгах. У чэрвені 2017 года заняў 334 месца ў брытанскім рэйтынгу Quacquarelli Symonds, прадстаўлены ў Times Higher Education і ўпершыню ўвайшоў у Шанхайскі рэйтынг па фізіцы.

ЗАСЯЛЕННЕ

Студгарадок як новы свет

З 25 жніўня тысячы іншагародніх студэнтаў пачалі засяленне ў інтэрнаты. Яны знаёмяцца з новымі суседзямі, радасна сустракаюць старых сяброў. Пакоі зноў запоўненыя галасамі і смехам, а на кухнях запахла смачнай ежай. Газета «Універсітэт» паразмаўляла з дырэктарам студэнцкага гарадка **Алай МЕЛЕХ** і даведалася, якія ўмовы прадстаўляюцца студэнтам інтэрнатаў і як там жыць.

У 2017/2018 навучальным годзе заселіцца каля 8000 студэнтаў. Працэнт засялення павялічыўся прыблізна на 5-6 % у параўнанні з мінулым годам за кошт падвойнага выпуску на некаторых факультэтах ў 2016/2017 навучальным годзе. Жылыя месцы прапарцыйна размеркаваны паміж факультэтамі і інстытутамі. Асаблівая ўвага – першакурснікам: для іх зарэзервавана чвэрць ад агульнай колькасці месцаў. Рашэннем Савета БДУ ў гэтым навучальным годзе ў інтэрнаты заселіцца 100 % першакурснікаў механіка-матэматычнага, фізічнага, біялагічнага, хімічнага, геаграфічнага, ваеннага, а таксама факультэтаў прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, а для астатніх факультэтаў гэтая лічба складзе 85 %. Размеркаваннем студэнтаў па пакоях займаецца камісія па жыллёва-бытавых пытаннях факультэта, дзе вучыцца студэнт, якую ўзначальвае намеснік дэкана па вучэбна-выхаваўчай рабоце.

Пражыванне

Студэнцкі гарадок БДУ налічвае 9 інтэрнатаў для студэнтаў і адзін для супрацоўнікаў. Два з іх зусім новыя, знаходзяцца на тэрыторыі Студэнцкай вёскі, побач з метро, паркам і гандлёвымі цэнтрамі. Большасць астатніх інтэрнатаў падтрымліваюцца за кошт капітальнага і касметычнага рамонтаў. Падчас працоўнай змены будатрады на працягу месяца добраўпарадкоўвалі інтэрнаты і рыхтавалі іх да новага навучальнага года.

Для моладзі створаны неабходныя ўмовы для пражывання і паспяховай вучобы. Усе інтэрнаты аснашчаны мэбляй і пасцельнымі рэчамі, маюцца абсталяваныя кухні і санвузлы, у будынках размешчаны буфеты, сталовыя і кафэ. У інтэрнатах № 2, 4, 7 і 11 працуюць пральні, у кожным інтэрнаце выдаюць пасцельную бялізну. Таксама ў некаторых з іх ёсць цырульні, майстэрні па рамонце абутку і адзення. Амаль у кожным інтэрнаце ўладкаваны тэрміналы для электроннай аплаты паслуг або інфакіёскі. Рыхтавацца да заняткаў можна ў абсталяваных усім неабходным пакоях для самападрыхтоўкі. У інтэрнатах ёсць магчымасць і для адпачынку: пасля складаных пар студэнты могуць пагуляць у більярд ці тэніс, заняцца спортам у трэнажорных залах, патанцаваць.

Усе інтэрнаты падзяляюцца на тры катэгорыі. Жыллё кватэрнага тыпу адпавядае першай катэгорыі, блокавага – другой і калідорнага – трэцяй. Кошт пражывання ў інтэрнатах залежыць толькі ад памеру базавай велічыні. Да прыкладу, за жыллё першай катэгорыі штомесяц давядзецца плаціць 1,2 базавай велічыні, што ў рэальных грашах складзе Br27,6. За жыллё другой катэгорыі аплата складзе 0,8 базавай велічыні, або Br18,4, за пакой у інтэрнаце трэцяй катэгорыі аплата складзе 0,4 базавай велічыні, або Br9,2. Цэны на пражыванне ў гэтым годзе застаюцца нязменным.

Гарачая лінія

Па пытаннях засялення ў інтэрнаты з 21 жніўня па 1 верасня працавала гарачая лінія. Часцей за ўсё студэнты тэлефанавалі, каб даведацца, ці ёсць у інтэрнатах пасцельная бялізна, а у пакоі\блоку халадзільнік, якія электрапрыборы дазволеныя. Першакурснікаў цікавіла, ці далі ім месца ў інтэрнаце, калі не – пад якім нумарам у чарзе яны знаходзяцца. Былі і незвычайныя выпадкі, напрыклад, студэнта засялілі на вельмі высокі паверх, а ён ніколі не ездзіў на ліфце і хацеў даведацца, як памяняць пакой. А некаторыя і зусім блыталі ВНУ: тройчы на гарачую лінію звярталіся бацькі студэнтаў, якія паступілі ў БДУФК, з пытаннем: чаму ім не далі месца ў інтэрнаце.

Адаптацыя

Вельмі важным момантам, лічаць у студгарадку, з'яўляецца адаптацыя студэнтаў, якія пражываюць у інтэрнаце ўпершыню. Штогод студэнцкімі саветамі месца з адміністрацыяй і педагагічным складам інтэрнатаў праводзяцца сходы з першакурснікамі. На дадзеным мерапрыемстве ім тлумачаць правілы пражывання, распавядаюць пра пакоі сацыяльна-бытавога і культурнага прызначэння, гурткі і секцыі, якія працуюць на базе Студэнцкага гарадка. Традыцыйным мерапрыемствам стала «прысвячэнне» для першакурснікаў, якое арганізоўвае студэнцкі савет інтэрната.

Уся інфармацыя адносна інтэрнатаў БДУ і правілаў пражывання даступная на сайце: ***studgorodok.bsu.by***, а каб заўсёды быць у курсе падзей, далучайцеся да афіцыйнай групы ва «УКантакце»: ***vk.com studgorodokbsu***.

Студэнцкі гарадок БДУ – гэта выдатная пляцоўка для рэалізацыі творчага патэнцыялу і лідарскіх якасцяў навучэнцаў універсітэта праз органы студэнцкага самакіравання. Гэта гурткі і клубы па інтарэсах. У кожнага студэнта, які пражывае ў інтэрнаце, ёсць шанец стаць не толькі гледачом, але і непасрэдным удзельнікам розных мерапрыемстваў: конкурсу студэнцкай песні «Срэбныя струны», конкурсаў «Супермен», «Міс Вясна», Hostel Mix або «Зорная пара», Кубка КВЗ імя Віктара Толкача, кулінарнага паядынку, турніраў па інтэлектуальных гульнях, выстаў студэнцкай творчасці, міжуніверсітэцкага фестывалю нацыянальных культур і многіх іншых. Пастаяць за гонар роднага інтэрната, прадэманстраваць сваю сілу, спрыт і хуткасць студэнты могуць падчас правядзення сустрэч па футболе, валейболе, весела правесці час у турыстычных паходах і экскурсіях.

Усмешкі за беспарадак

«Пасля першых тыдняў вучобы першакурснікі разумеюць, што патрапілі ў зусім новы свет – студэнцкае жыццё. І каб яно было яркім і цікавым, Студэнцкі гарадок БДУ жадае запомніць кожную хвіліну, праведзеную ў інтэрнаце. Твар абуджанага вашым будзільнікам суседа, якому да другой пары. Першую яечню суседкі-першакурсніцы, якая ніколі не гатавала дома. Усмешку сябра студэнцкага савета, які ўбачыў ваш беспарадак падчас праверкі санітарнага стану. Чэргі ў перыяд засялення. І, вядома, моманты, калі ўсе вы збіраецеся разам!» – раіць дырэктар студэнцкага гарадка Ала Мелех.

Дар'я КОЎЗА

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

02 верасня Тарасік Марыя Іосіфаўна, старшы навуковы супрацоўнік НДЛ энергаэфектыўных матэрыялаў і тэхналогій, фізічны факультэт

02 верасня Сабалеўская Алена Паўлаўна, дацэнт кафедры дыскрэтнай матэматыкі і алгарытмікі, факультэт прыкладнай матэматыкі і інфарматыкі

05 верасня Суздаль Станіслаў Валер'евіч, дацэнт кафедры вэб-тэхналогій і камп'ютарнага мадэлявання, механіка-матэматычны факультэт

11 верасня Уласаў Анатоль Цімафеевіч, вядучы навуковы супрацоўнік НДЛ фізікі электронных матэрыялаў, фізічны факультэт

14 верасня Клімовіч Людміла Аляксандраўна, дацэнт кафедры міжнародных эканамічных адносін, факультэт міжнародных адносін

17 верасня Шулякоўскі Георгій Сяргеевіч, дацэнт кафедры тэарэтычнай фізікі і астрафізікі, фізічны факультэт

20 верасня Яромава Ніна Георгіеўна, дацэнт кафедры агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі, біялагічны факультэт

22 верасня Мацюшэўская Кацярына Віктараўна, дацэнт кафедры агульнага землязнаўства і гідраметэаралогіі, геаграфічны факультэт

28 верасня Гарошка Мікалай Мікалаевіч, дацэнт кафедры неарганічнай хіміі, хімічны факультэт

30 верасня Конанаў Сяргей Гаўрылавіч, дацэнт кафедры геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі, механіка-матэматычны факультэт

АБ'ЯВЫ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ міжнародных эканамічных адносін;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: біяфізікі, фізічнай геаграфіі свету і адукацыйных тэхналогій, міжнароднага турызму;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: фізічнай оптыкі, фізічнай электронікі і нанатэхналогій, вышэйшай матэматыкі, вылічальнай матэматыкі, дыскрэтнай матэматыкі і алгарытмікі, матэматычнага мадэлявання і аналізу дадзеных, шматпрацэсарных сістэм і сетак, тэхналогій праграмавання, агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі, неарганічнай хіміі, эканамічнай і сацыяльнай геаграфіі, сучаснай беларускай мовы, гісторыі паўднёвых і заходніх славян, этналогіі, музеалогіі і гісторыі мастацтва, фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці, міжнародных эканамічных адносін, нямецкай мовы, экалогіі чалавека;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: англійскага мовазнаўства, замежнай літаратуры, класічнай філалогіі, крыніцазнаўства, крымінальнага права, германскіх моў, фізічнага выхавання і спорту, мовазнаўства і краіназнаўства Усходу, англійскай мовы і моўнай камунікацыі, тэхналогій камунікацыі;

АСІСТЭНТА КАФЕДРЫ інфарматыкі і камп'ютарных сістэм.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.

МІЖНАРОДНЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ЭКАЛАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ ІМЯ А.Д.САХАРАВА БДУ
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ агульнай экалогіі, біялогіі і экалагічнай генетыкі – 1 штатная адзінка;

СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА кафедры энергаэфектыўных тэхналогій – 2 штатныя адзінкі;

ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРЫ агульнай экалогіі, біялогіі і экалагічнай генетыкі – 1 штатная адзінка.

Тэрмін падачы дакументаў – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220070 г. Мінск вул. Даўгабродская, 23, корпус 1, аддзел кадравай і арганізацыйнай працы, каб. 202, тел.398 88 25, эл. пошта: info@iseu.by, ok@iseu.by»

ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ мастацтваў;

ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ маркетынгу.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, аддзел кадраў, тэл. 3060027, 3060028.

БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

Пра прыёмную кампанію–2017 у БДУ – БелТА, tut.by, БТ-1 (10.07), minsknews.by, zviazda.by (11.07), naviny.by, БелаПАН, mail.ru, «Знамя юности», СТБ (12.07), interfax.by, kp.by (13.07), sputnik.by, sb.by, АНТ (17.07), telegraf.by, wuz.by, aif.by (18.07), nastgaz.by (20.07), ecopress.by (28.07).

БДУ ўпершыню ўвайшоў у 500 найлепшых універсітэтаў Шанхайскага прадметнага рэйтынгу ARWU па фізіцы – БелТА, tut.by, wuz.by, news.21.by, rg.ru (29.06).

БДУ запусціў Telegram-бот для абітурыентаў – interfax.by, wuz.by (14.07), zviazda.by (01.07), sputnik.by (02.07), citydog.by (06.07).

Пра працу летняй школы рускай мовы для замежных грамадзян у БДУ – zviazda.by (01.07), naviny.by, newspln.ru, БелТА, n1.by, mir.pravo.by (02.07), mail.ru, edu.gov.by (04.07), soyuz.by, wuz.by (11.07), tro-soyuz.com, soyuz.by (12.07), zviazda.by (13.07).

У магістратуры БДУ адкрыта новая спецыяльнасць «праектаванне складаных інтэграваных сістэм» – kv.by, megacat.by, ecopress.by, wuz.by (12.07), «Звязда» (20.07).

Пра працу Міжнароднага сімпозіума па Еўра-Азіяцкай біяразнастайнасці SEAB–2017 у БДУ – БелТА, belarus.by, wuz.by (04.07).

У БДУ адкрыюцца курсы па вывучэнні мовы хіндзі – interfax.by, wuz.by (14.07), zviazda.by (16.07), «Настаўніцкая газета» (18.07), СТБ (28.07).

Пра перамогі ліцэістаў БДУ на міжнародных алімпіядах па матэматыцы, фізіцы, хіміі – БелТА (14.07), wuz.by, mlyn.by, minsknews.by, БелТА, tut.by (17.07), ecopress.by, «Настаўніцкая газета» (18.07), zviazda.by, «Звязда» (20.07), tut.by, sb.by, aif.by, wuz.by (24.07), БелТА, sputnik.by, edu.gov.by, zviazda.by, kp.by, 21.by (24.07), «Минский курьер» (25.07), zviazda.by (26.07), «Знамя юности» (27.07), «Народная газета» (28.07).

Пра міжнародную летнюю школу беларусістыкі, якая працавала ў РІВШ БДУ – naviny.by, sputnik.by, mir.pravo.by, n1.by, БелТА (02.07), mail.ru, СТБ, 1-ы Нацыянальны канал Беларускага радыё, СТБ (04.07), nastgaz.by, «Настаўніцкая газета» (06.07), zviazda.by (20.07), «Звязда» (20.07).

Пра ўдзел студэнтаў гістарычнага факультэта БДУ ў экспедыцыі ў археалагічным комплексе Кардон – БелТА, mir24.tv, lenta.ru (26.07), news.mail.ru, sputnik.by (27.07), zviazda.by, БелаПАН, tvkultura.ru, wuz.by (28.07), zviazda.by (01.08), АНТ (04.08), tut.by (05.08).

Пра высокія пазіцыі БДУ ў Сусветным вэбаметрычным рэйтынгу ўніверсітэтаў Webometrics Ranking of World Universities (WRWU) – БелТА, naviny.by, belarus.by, wuz.by (02.08), СТБ, n1.by, sputnik.by (03.08), zviazda.by (08.08).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

УНІВЕРСІТЭТ

1 верасня 2017 года, № 12 (2180)

ШКОЛА ПЕРШАКУРСНІКА

Учарашнія школьнікі сталі студэнтамі. Іншае жыццё, іншыя правілы. Каб вы не згубіліся ў плыні новай інфармацыі, прапануем вам у дапамогу своеасаблівы компас па ўніверсітэце і яго структурах – «Школу першакурсніка». З пытаннямі, якія вас цікавяць, звяртайцеся ў рэдакцыю газеты, і мы будзем рады вам дапамагчы.

ШУКАЕМ ТАЛЕНТЫ

«КРЫЖАЧОК» – ансамбль танца, заслужаны аматарскі калектыў РБ

Заснаваны ў 1945 г. Рэпертуар – беларускія народныя танцы і танцы народаў свету (рускія, украінскія, польскія, яўрэйскія і іншыя). Уладальнік шматлікіх узнагарод розных фестываляў і конкурсаў Беларусі і замежжа. За час існавання калектыў прадстаўляў беларускую культуру больш чым у 50 краінах свету.

«НЕРУШ» – фальклорна-этнаграфічны ансамбль, заслужаны аматарскі калектыў РБ

Заснаваны ў 1980 г. Збірае нацыянальную музыку, песні, абрады і звычаі ў фальклорных экспедыцыях па Беларусі. За час існавання калектыў прадстаўляў беларускую культуру ў шматлікіх краінах.

НАРОДНЫ АРКЕСТР НАРОДНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ

Заснаваны ў 1946 г. У рэпертуары: пераклады класічнай музыкі, апрацоўкі беларускіх і рускіх народных песень, песні народаў свету, старажытныя рамансы, творы беларускіх кампазітараў. У 2011 г. аркестр стаў лаўрэатам IV Міжнароднага фестывалю-конкурсу LIBERTANGO імя А. П'яцолы.

НАРОДНАЯ СТУДЭНЦКАЯ ХАРАВАЯ КАПЭЛА

Калектыў заснаваны ў 1946 г. У рэпертуары музыка розных перыядаў: старажытная беларуская, руская і заходняя музыка, музыка Сярэдніх вякоў, XIX стагоддзя і сучасная.

З 2006 г. капэла БДУ з'яўляецца адным з заснавальнікаў міжнароднага форуму студэнцкіх хароў «Папараць-кветка БДУ».

«НА БАЛКОНЕ» – народны студэнцкі драматычны тэатр

Заснаваны ў 1946 г. Накіраванасць – драматычныя спектаклі.

З 2004 года – заснавальнік міжнароднага фестывалю студэнцкіх тэатраў «Тэатральны куфар». З 2006 г. – член Міжнароднай асацыяцыі ўніверсітэцкіх тэатраў AITU/IUTA.

«НА ФІЛФАКУ» – народны студэнцкі музычны тэатр

Заснаваны ў 1997 г. Накіраванасць – спектаклі з элементамі мюзіклаў, камедыі.

З 2004 года – заснавальнік міжнароднага фестывалю студэнцкіх тэатраў «Тэатральны куфар».

КЛУБ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫХ ГУЛЬНЯЎ БДУ

Існуе з 1997 г. Мэта клуба – рэалізацыя інтэлектуальнага патэнцыялу студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ. Клуб удзельнічае ў гарадскіх, рэспубліканскіх і міжнародных інтэлектуальных гульнях. З 2013 года клуб праводзіць Адкрытую інтэлектуальную лігу БДУ — чэмпіянаты па «Што? Дзе? Калі?», «Брэйн-рынгу» і «Сваёй гульні», куды ў якасці гасцей запрашаюцца найлепшыя студэнты мінскіх ВНУ.

«ТУТЭЙШАЯ ШЛЯХТА» – народны фальклорны ансамбль

Створаны ў 1992 г. Накіраванасць – старажытныя беларускія народныя песні і танцы, калісьці папулярныя ў асяроддзі беларускай і польскай шляхты. За час існавання калектыў прадстаўляў беларускую культуру ў шматлікіх краінах.

ВАКАЛЬНАЯ СТУДЫЯ БДУ

Існуе з 2004 г. Накіраванасць – вывучэнне асноў эстраднага вакалу. Удзельнікі студыі неаднаразова станавіліся лаўрэатамі міжнародных і рэгіянальных конкурсаў. Найбольш выдатныя выпускнікі студыі – Вольга Палюшык, Ягор Ваўчок, Антон Мартынаў, Дзмітрый Нікановіч і іншыя.

Творчая група «MiM-BSU» («МІМЫ БДУ»).

Заснавана ў 2012 годзе. Накіраванасць – вывучэнне мастацтва пантамімы і танцавальнай імправізацыі. Мімы і аніматары творчай групы забаўляюць гасцей на розных мерапрыемствах універсітэта і горада Мінска (мінскі форум вулічных тэатраў, міжнародная акцыя «Ноч музеяў», святкаванне Дня моладзі ў Віцебску на фестывалі «Славянскі базар», фестываль 3D-малюнкаў «Мінск будучыні», святкаванне Дня горада Мінска і інш.).

Танцавальны калектыў FREAKS БДУ

Каманда яркіх, вясёлых і энергічных студэнтаў БДУ, якіх аб'ядноўвае любоў да танцаў. Іх абраны кірунак — street dance. FREAKS — пераможцы фестывалю эстрады БДУ, удзельнікі моладзевага марафону ў рамках фестывалю «Славянскі базар у Віцебску–2014», лаўрэаты рэспубліканскага конкурсу танцавальных калектываў Global Dance–2016.

Тэлефон для сувязі: 80295729404.

Творчы саюз Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Самая маладая арганізація нашай alma mater, якая аб'ядноўвае таленавітых студэнтаў розных факультэтаў. Творчы саюз БДУ займаецца падтрымкай маладых спевакоў, танцораў, музыкаў, акцёраў, фатографаў, дызайнераў, мастакоў, рэжысёраў, вядучых мерапрыемстваў, арганізатараў і ўсіх, хто хоча займацца творчасцю.

Даведкі: http://vk.com/tsbsu, 80172095469.

Электронны адрас: infotsbsu@gmail.com.

Акрамя таго, у БДУ дзейнічаюць народны хор народнай песні выкладчыкаў і супрацоўнікаў **«РОДНІЦА»,** мужчынскі вакальны гурт **«ГАЛАНТ»,** дзіцячы ансамбль танца **«ЛІТАРЫНКА», КВЗ БДУ** і інш.

Вас чакаюць ва ўпраўленні па справах культуры па адрасе: пр. Незалежнасці, 4, каб. 211, тэл. 2095053, 2095469.

Таксама дадатковую інфармацыю пра мерапрыемствы і калектывы ўпраўлення па справах культуры БДУ можна знайсці па адрасе *http://vk.com/cultura_bgu.*

ФУНДАМЕНТАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БДУ

абанементы
чытальныя залы
медыятэкі

Час працы:
Пн-Пт: 9.00-19.00
Сб: 9.00-17.00

library.bsu.by

fl_bsu

электронны каталог
электронная бібліятэка
падпісныя базы дадзеных

24/7

У БІБЛІЯТЭКУ

Якая яна – сучасная ўніверсітэцкая бібліятэка?

Многія студэнты, паступаючы ў БДУ, не падазраюць, якія інфармацыйныя магчымасці дае ім Фундаментальная бібліятэка. Сёння ўніверсітэцкая бібліятэка – гэта каля 2 млн тамоў універсальнага фонду айчыннай і замежнай літаратуры; 8 абанементаў, 13 галіновых і спецыялізаваных чытальных зал і 3 медыятэкі. Шматлікія чытальныя залы арганізаваны па сістэме адкрытага доступу да фондаў, што нашмат спрашчае працэс пошуку неабходнай літаратуры. Штогод бібліятэка набывае каля 10 тыс. асобнікаў новых выданняў, атрымлівае каля 400 найменняў айчынных і замежных перыядычных выданняў. Акрамя таго, бібліятэка валодае фондам рэдкіх і каштоўных выданняў, самая старая кніга датуецца 1580 годам. Электронны каталог змяшчае апісанне друкаваных дакументаў з фонду бібліятэкі, дапамагае хутка знайсці патрэбнае выданне.

У дадатак да традыцыйных выданняў у бібліятэцы ёсць доступ да ліцэнзійных паўнатэкставых і бібліяграфічных баз дадзеных з навуковай і навукова-папулярнай інфармацыяй. Электронная бібліятэка БДУ **(http://elib.bsu.by/)** змяшчае больш за 117 тысяч дакументаў, вырашае пытанне забяспечанасці электроннымі копіямі вучэбных выданняў, а таксама прадстаўляе доступ да навуковых прац універсітэта: часопісаў, манаграфій, артыкулаў, матэрыялаў канферэнцый, найлепшых дыпломных і магістранцкіх праектаў і інш. З электроннымі рэсурсамі Фундаментальнай бібліятэкі можна працаваць 24 гадзіны ў суткі з дамашняга камп'ютара.

Усе чытальныя залы маюць кропкі WiFi – бесправаднога доступу ў інтэрнэт. Акрамя таго, у чытальных залах і медыятэках усталявана 136 камп'ютараў для самастойнай працы. Навучальныя заданні і ўласныя творчыя ідэі можна рэалізаваць з дапамогай 3D-прынтара. Амаль на ўсіх пунктах абслугоўвання ёсць дадатковыя паслугі ксеракапіравання, сканавання, раздрукоўкі і перфапераплёту дакументаў. Бібліятэка актыўна ўдзельнічае ў міжнародных акцыях («Бібліяноч», «Горад і кнігі»), руху па бясплатным абмене кнігамі – BookCrossing. Але і гэта не ўсё.

Сучасная ўніверсітэцкая бібліятэка – буйны сацыякультурны цэнтр. На базе бібліятэкі дзейнічаюць дыскусійны кінаклуб «Фруза» і клуб аматараў мастацкага слова «КЛУмБа» **(https://vk.com/fb_klumba);** праводзяцца прагляды кінастужак, ладзяцца сустрэчы з рэжысёрамі, акцёрамі, кінакрытыкамі, пісьменнікамі, тэматычныя вечарыны, конкурсы і віктарыны.

Здзейсніць віртуальную экскурсію па бібліятэцы, азнаёміцца з яе асноўнымі інфармацыйна-бібліятэчнымі паслугамі Вам дапаможа **«Віртуальны гід».**

Па дадатковую інфармацыю можна звярнуцца на сайт бібліятэкі **(http://library.bsu.by/),** у групу ў VK **(https://vk.com/fl_bsu)** ці па тэлефонах **2095037** і **2095033.**

Прафсаюз студэнтаў БДУ

Пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ – самае масавае грамадскае моладзевае аб'яднанне ва ўніверсітэце і галоўны сацыяльны партнёр, які абараняе законныя інтарэсы навучэнцаў.

Прафсаюзная арганізацыя – гэта юрыдычна-прававая падтрымка; кансультацыі па юрыдычных і сацыяльна-прававых пытаннях; студэнцкае прадстаўніцтва ў перамовах з кіраўніцтвам ВНУ па ўсіх пытаннях арганізацыі адукацыйнага працэсу і пазавучэбнай дзейнасці; грамадскі кантроль умоў вучобы і побыту, харчавання і медыцынскага абслугоўвання; рашэнне жыллёва-бытавых пытанняў; арганізацыя адпачынку і аздараўлення, другаснай занятасці; аказанне матэрыяльнай дапамогі; падтрымка асобных сацыяльных катэгорый навучэнцаў і многае іншае.

Прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ арганізуе і праводзіць вялікую колькасць мерапрыемстваў, акцый, праграм і праектаў: BSU FEST, «Канікулы ў Лагойску», «Сустрэчы з вядомымі і выбітнымі людзьмі Беларусі: Персоны», «Павіншуем нашых мам разам!», «Масленіца»,«У Новы год – разам!», «Перамога ў аб'ектыве», «Папараць-кветка: BSU NIGHT і інш., конкурсаў, сустрэч, круглых сталоў, семінараў, навучанняў, маніторынгаў; развівае і рэалізуе мноства ініцыятыў і ідэй шляхам сацыяльнай актыўнасці.

«Мы з кожным, мы з табой!»

220030, г. Мінск, пр.Незалежнасці, 4
(каб. 106 галоўнага корпуса БДУ)
тэл. **(017) 209 57 05, 209 51 25**
email: **bsu.profkom@gmail.com, profkom@bsu.by**
афіцыйны сайт: **www.profkom.bsu.by**
сацыяльныя сеткі: **vk.com/profkom_studentov_bsu, https://www.instagram.com/profkombsu/, https://twitter.com/profkombsu**

СТАНЬ ЛІДАРАМ!

Падчас навучання ў БДУ маладыя людзі вучацца быць сапраўднымі грамадзянамі краіны. Вялікую ролю ў гэтай справе адыгрываюць студэнцкія арганізацыі альма-матар, якія аб'яднаныя ў Студэнцкую асамблею БДУ.

Пярвічная арганізацыя ГА «БРСМ» з правамі РК БДУ

Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі БДУ аб'ядноўвае ініцыятыўных маладых людзей, якія могуць рэалізаваць свой патэнцыял і сфарміраваць у сабе лідарскія якасці. Мы ўмацоўваем традыцыі альма-матар і ладзім мерапрыемствы, якія сталі візітоўкамі БРСМ БДУ: «Універсітэт – твой крок у будучыню», універсітэцкі турысцкі злёт, форум «Стань найлепшым», кубак першакурсніка і квэст-гонка FlashRace.

Запрашаем у наш дружны калектыў!

ГА «Студэнцкі саюз БДУ»

Студэнцкі саюз – гэта дружная каманда творчых студэнтаў, якім не абыякава, што іх атачае і дзе яны вучацца. Мы супрацоўнічаем з моладзевымі арганізацыямі замежных ВНУ. Нашы праекты: агляд-конкурс «Капуснік» (для першакурснікаў), «Студэнцкі адукацыйны клуб «БРЫЗ», «Студэнцкі баль», фотавеламарафон, фотаконкурс «БДУ ў тваім фармаце», «Смачныя вандроўкі», «Мая школа» (заняткі з дзецьмі са школ і дзіцячых дамоў), «Міс і містар» факультэтаў і інш.

З намі ў цябе будзе ўнікальная магчымасць стварыць свой праект!

Савет старастаў БДУ

У вясёлым, але ў той жа час складаным універсітэцкім жыцці студэнцкай групе бывае цяжка прайсці без рулявога. Старасты дапамагаюць вырашаць пытанні па вучобе, камунікуюць з дэканатам. Савет старастаў удзельнічае ў арганізацыі мноства мерапрыемстваў – ад агульных святаў да студэнцкіх канферэнцый, семінараў і практыкумаў.

Стань лідарам – стань старастам!

Студэнцкі савет па якасці адукацыі

ССЯА праводзіць штогадовае анкетаванне студэнтаў; уносіць прапановы па рэарганізацыі працы факультэцкіх бібліятэк; займаецца маніторынгам вынікаў экзаменацыйных сесій; студэнты маюць магчымасць уплываць на працэс кіравання адукацыйнай сістэмай БДУ, распрацоўваць рэкамендацыі па яго аптымізацыі.

Палепшы сам наша студэнцкае жыццё!

Звяртайцеся ва ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю: пр. Незалежнасці, 4, галоўны корпус, каб. 110, 112.
Тэл. 209-55-59, 209-54-38, 209-50-59.

БДУ ў сацсетках

Папулярнасць сацыяльных сетак пастаянна расце. Гэта і зразумела: лепшага месца для зносін, чым сацыяльныя сеткі, і не прыдумаеш! Там можна і абвясціць навіны, і пацешыцца, і дапамагчы адзін аднаму ў цяжкую хвіліну.

БДУ разумее гэта і імкнецца быць бліжэйшым да сваіх студэнтаў, размаўляць з імі на адной мове. Менавіта таму наш універсітэт так шырока прадстаўлены ў сацыяльных сетках!

БДУ прысутнічае ў наступных сацыяльных медыя: «УКантакце», Facebook, Twitter, LinkedIn, Instagram, Youtube, Google+, Telegram, ResearchGate. Усе яны, зразумела, маюць свае асаблівасці, але іх аб'ядноўвае адно: імкненне стаць аператыўнымі інфармацыйнымі парталамі пра жыццё ўніверсітэта! Усе самыя свежыя навіны і падзеі, анонсы, адукацыйныя праграмы, а таксама аператыўнае кансультаванне можна знайсці ў нашых сацыяльных сетках!

Падпісвайцеся і станьце часткай віртуальнай прасторы БДУ! Падрабязнасці на **www.bsu.by**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

1 верасня 2017 года
Падпісана да друку 30.08.2017 г.
Зак. 517. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ».
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, г. Мінск.

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by

ПСІХАЛАГІЧНАЯ СЛУЖБА

Психологическая служба БГУ

Психологическая служба БГУ

ФЕСТИВАЛЬ ПРАКТИЧЕСКОЙ ПСИХОЛОГИИ

ФЕСТИВАЛЬ ПРАКТИЧЕСКОЙ ПСИХОЛОГИИ –

комплекс мероприятий по актуальным проблемам практической психологии, который реализуется в течение всего учебного года. Каждый месяц имеет свою направленность и содержательное наполнение с учетом специфики учебной деятельности студентов и их жизнедеятельности.

1 семестр

Приглашаем посетить **ИНТЕРАКТИВНЫЕ ВЫСТАВКИ «МИР ПСИХОЛОГИИ».** Вы сможете погрузиться в интереснейший мир и узнать много нового о психологии человека, поучаствовать в экспресс-диагностике, психологических играх и упражнениях, задать вопросы специалистам, познакомиться с психологом вашего факультета и с деятельностью психологической службы БГУ. Как правило, выставка работает два дня в каждом из учебных корпусов (с графиком выставок можно ознакомиться на сайте, или следите за информацией на стендах психологической службы). Первый день посвящается первокурсникам, а второй – всем желающим. Приходите – будет полезно и интересно!

В начале месяца и до его середины будут объявлены наборы в тренинговые группы, предложена обширная программа практических занятий. Ведь это самое подходящее время заняться саморазвитием и самопознанием, совершить личностный рост, сделать первые образовательные шаги в профессиональной карьере, расширить свои творческие возможности и многое другое, что позволяют реализовать мероприятия в рамках **ПРАКТИКУМОВ** психологической службы БГУ. Обязательно приходите! Более подробная информация будет размещена на стендах психологической службы БГУ, а также на сайте.

Продолжаем заниматься саморазвитием, но на уровне **МАСТЕР-КЛАССОВ.** Для студентов они будут проводиться в рамках проекта «Равный обучает равного». И это хорошая возможность, чтобы поддержать студенческие социальные проекты, волонтерское движение. Для кураторов, преподавателей и студентов, обучающихся по социально-психологическим специальностям, будут предложены специализированные занятия. Следите за рекламой!

У каждого из нас есть вопросы, на которые мы ищем ответы. В этом месяце у вас будет возможность задать различные интересующие вас вопросы из области психологии – про специфику межличностных отношений, самооценку, особенности мировоззрения, оказание психологической помощи и другие. Такого рода мероприятие называется **БРИФИНГ.** Специалисты нашей психологической службой и другие, привлеченные специалисты (возможно, врачи, юристы и т.д.), ответят на них и представят свои комментарии на различных информационных ресурсах. Не упустите такую уникальную возможность! По итогам брифинга будут организованы специальные мероприятия, чтобы удовлетворить сформированный запрос.

Социально направленные **АКЦИИ** всегда помогают привлечь внимание к актуальным проблемам и задуматься об их важности. Но акции позволяют сделать не только это, а, что более важно, обозначить, прояснить пути решения проблем. Наши акции будут направленына то, чтобы поддержать студентов во время сессии, помочь мобилизовать усилия и достойно пройти экзаменационные испытания. Мы очень часто проходим через те или иные испытания – для этого нам и дана жизнь! Давайте научимся преодолевать препятствия уверенно и эффективно!

ПСІХАЛАГІЧНАЯ СЛУЖБА БДУ

2 семестр

В начале второго семестра мы приглашаем вас принять участие в **АУКЦИОНЕ ПСИХОЛОГИЧЕСКИХ УСЛУГ.** Что это такое? Аукцион – публичное мероприятие по определению наиболее востребованных (популярных) интеллектуальных продуктов (лотов). Психологические услуги – перечень основных видов деятельности в рамках профессиональной компетенции педагогов-психологов и психологической службы БГУ. А остальное – интрига! Ее разгадку вы сможете получить во время мероприятия. Кстати, победители получат призы!

В этом месяце **ПРАКТИКУМЫ** мы посвящаем миру наших внутренних переживаний, эмоций, состояний. На практических занятиях будут затронуты темы межличностных отношений по всему спектру проблем – от «любви до ненависти». Т.е. о том, как выстраивать эффективные взаимоотношения, научиться доверять, повысить коммуникативный уровень, решать конфликты, избегать конфронтации. Ждем вас на занятиях!

На различных информационных ресурсах будет размещена специально организованная **(ИНФОРМАЦИОННЫЕ БЛОКИ)** актуальная информация: самопознание (тесты, результаты исследований и научной мысли); самопонимание и самопринятие (критерии, копинги, модели); самооценка (шкалы, механизмы, регуляторы); самоконтроль (приемы и методы, технологии); саморегуляция (комплексы, релакс и аутотренинг, общедоступные терапии).
Ресурсы будут содержать не только непосредственно информацию, но и ссылки на дополнительные источники. Следите за объявлениями!

Хорошей традицией стало проведение в университете **НЕДЕЛИ СЕМЬИ** (напоминаем, что 15 мая – это Международный день семьи). Мы стараемся найти новые формы проведения мероприятий по данной тематике и используем уже хорошо себя зарекомендовавшие: школа осознанного родительства, клуб молодой семьи, культурно-просветительские форумы, торжественные заседания, консультации специалистов и другое.
Следите за информацией и не забудьте принять участие в наших мероприятиях!

И опять **АКЦИИ.** На этот раз чтобы обратить ваше внимание, что впереди каникулы, а значит, будет время, чтобы поработать над собой, своими способностями и навыками и, может быть, даже поменять себя и свои привычки. Конечно, если в этом есть необходимость!
Не проходите мимо наших рабочих зон, и вы сможете расширить свои знания и навыки в области практической психологии!

Если вы хотите принять участие в мероприятиях **ФЕСТИВАЛЯ ПРАКТИЧЕСКОЙ ПСИХОЛОГИИ,** оказать нам помощь в его организации и проведении, интересуетесь психологией и хотите приобрести практические навыки, приходите, звоните, пишите.

ДАВАЙТЕ СОТРУДНИЧАТЬ!